The efficiency of economic activity is determined by the key performance indicators for this industry within the framework of a comprehensive analysis. Thus it is possible to define also the standard features for the enterprises of all spheres of manufacture. The main types of manufactured products, current production and planned, planned and desired volume of production gives the company information about the use of primary and secondary production. The levels of capacity utilization, as well as non-production facilities, the cost of their maintenance are identified. From the above information there is a clear scheme of units, their organization and interaction, to identify or supplement the scheme of enterprise management structure, the number of production staff, their payroll, the average salary of production and management staff.

Part of this analysis should be an analysis of the geographical location of production, ecological status of the environment, climatic conditions, features of legislation in the region of management. All of the above helps to identify the most effective tactical and strategic decisions of management in the short and long term in the face of rapid changes in the international environment.

## ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ ЭКСПАРТНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ МЭБЛЕВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Хахлова М.І.*
*Навуковы кіраўнік: Лізакова Р.А., к.э.н., дацэнт*
*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Рэспубліка Беларусь*

Праблема нарошчвання экспартнага патэнцыялу і павышэння канкурэнтаздольнасці адносіцца да ліку прыярытэтных для прадпрыемстваў усіх галін народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Асаблівую актуальнасць яна мае для ляснога сектара эканомікі, што абумоўлена спрыяльнымі перадумовамі для яго развіцця. Аснову экспарту галіны складае вытворчасць мэблі і камплектуючых матэрыялаў. Паспяховае развіццё гэтага напрамку дазваляе максімальна перапрацоўваць сыравіну на тэрыторыі краіны і экспартаваць гатовую прадукцыю з высокім дададзеным коштам.

У цяперашні час можна канстатаваць планамернасць і пэўную маштабнасць работ па захаванню і паляпшэнню вытворчага і экспартнага патэнцыялу мэблевай галіны і стварэнню базы для далейшага развіцця. Колькасць вытворцаў мэблі за 2015-2020 гады павялічылася ў 2 разы да больш чым 1,3 тыс. Тэмп росту экспарту па галіне ў 2020 годзе склаў 100,2%. Найбуйнейшым вытворцам мэблі ў краіне – канцэрнам «Беллеспаперапрам» – на знешнія рынкі было пастаўлена прадукцыі на $377,9 млн. З агульнага аб'ёму выпрацаванай прадпрыемствамі канцэрна прадукцыі 74,6% было рэалізавана на знешнія рынкі. Доля мэблевай прамысловасці на сённяшні дзень складае больш за траціну ў структуры экспарту прадукцыі лясной і дрэваапрацоўчай

прамысловасці [1]. Лідэрам у гэтай галіне з'яўляецца ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў».

Тэндэнцыі развіцця галіны можна растлумачыць некалькімі фактарамі. Напрыклад, якасць беларускай мэблі адказвае сусветным стандартам. Гэтаму спрыяе пільны адбор матэрыялаў, а таксама строгі кантроль на ўсіх этапах вытворчага працэсу. Айчынная сыравіна адносна танная, з чаго вынікаюць невысокія кошты. Такім чынам, экспартны патэнцыял прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь у мэблевай прамысловасці з'яўляецца каласальным. Поўнае яго выкарыстанне прадугледжвае актыўную работу па стратэгічным прасоўванні прадукцыі, выпускаемай прадпрыемствамі мэблевай прамысловасці Рэспублікі Беларусь, на знешнія рынкі. Абагульнены тэарэтычны матэрыял дазваляе звярнуць увагу на наступныя прылады, якія спрыяюць у гэтым прасоўванні.

1. Захаванне і нарошчванне канкурэнтных пераваг беларускай прадукцыі, вытворчасць якаснай прадукцыі, якая задавальняе патрабаванням замежнага спажыўца, паляпшэнне дызайну. Хуткае развіццё мэблевага рынка ставіць большасць вытворцаў у складанае становішча як следства хуткага састарэння тэхнічнай базы. Пастаяннае з'яўленне новых дызайнерскіх і тэхнічных рашэнняў патрабуе выкарыстання ўсё больш сучаснага абсталявання. Прадпрыемствы, якія не надаюць належнай увагі сваёй тэхнічнай базе, у хуткім часе страцяць магчымасць вырабляць сучасную, якасную і канкурэнтаздольную мэблю.

2. Правядзенне рэканструкцыі, мадэрнізацыі, тэхнічнага пераўзбраення вытворчасцяў. На сённяшні дзень унутранымі абмежавальнікамі развіцця экспартнага патэнцыялу выступаюць высокая матэрыяла- і энергаёмістасць існуючых мэблевых вытворчасцей. Недастатковая аптымізацыя вытворчасці прыводзіць да дэфіцыту фінансавых рэсурсаў для папаўнення абаротных сродкаў, інвеставання ў тэхнічнае пераасначшэнне, адмоўна ўплывае на канкурэнтаздольнасць выпускаемай прадукцыі.

3. Актывізацыя маркетынгавай дзейнасці з мэтай утрымання пазіцый на традыцыйных рынках, зніжэння рызыкі страт замежных рынкаў, пошуку новых альтэрнатыўных спажыўцоў прадукцыі, дыверсіфікацыі паставак. Нізкая дыверсіфікацыя знешнегандлёвых рынкаў становіцца адным з галоўных фактараў рызыкі. Разам з працай на традыцыйных рынках, прадпрыемствам мэблевай прамысловасці Рэспублікі Беларусь неабходна працягваць працу па дыверсіфікацыі рынкаў.

4. Адсочванне цэнавай сітуацыі на замежных рынках на аналагічную прадукцыю з мэтай вызначэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі на канкрэтных рынках і яе рэалізацыі па аптымальных цэнах.

5. Развіццё і аптымізацыя існуючай тавараправоднай сеткі, удасканаленне яе інфраструктуры, стварэнне новых суб'ектаў тавараправоднай сеткі за мяжой. Значны ўплыў на зніжэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі на тэрытарыяльна аддаленых знешніх рынках аказвае коштавая нагрузка, істотным элементам якой выступаюць транспартныя выдаткі [2]. Паляпшэнню дынамікі тэмпаў

росту экспарту могуць паспрыяць далейшае развіццё тавараправоднай сеткі, заключэнне новых кантрактаў на пастаўку прадукцыі з магчымым наступным прадастаўленнем дылерскіх правоў.

Нягледзячы на актыўныя пераўтварэнні ў сферы дрэваапрацоўчай прамысловасці, праведзеная дыягностыка стану экспартнага патэнцыялу прадпрыемстваў галіны выявіла неабходнасць удасканалення інструментаў, якія складаюць аснову нарошчвання экспартнага патэнцыялу.

**Літаратура:**


1. Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь. Знешні гандаль. URL: https://www.belstat.gov.by (дата доступу: 26.02.2021).
2. Праграма развіцця мэблевай вытворчасці канцэрна «Беллеспаперапрам» на перыяд да 2020 года. URL: http://www.bellesbumprom.by/images/text/programm/progr_mebel.pdf (дата доступу: 26.02.2021).


## АСАБЛІВАСЦІ ПАЛІТЫКІ ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЯ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ


*Клімянкоў І.А., Брэзіна А.М.*
*Навуковы кіраўнік: Гардзейчык С.В., м.э.н., выкладчык*
*Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт*


Імпартазамяшчэнне – палітыка дзяржавы, накіраваная на рацыяналізацыю імпарту тавараў і паслуг з дапамогай стымулявання айчынных вытворцаў аналагічных прадуктаў, стварэнне на тэрыторыі краіны новых прадпрыемстваў, у тым ліку і з удзелам замежнага капіталу для арганізацыі выпуску прадукцыі, якая раней імпартавалася [4].

Палітыка імпартазамяшчэння ў Рэспубліцы Беларусь накіравана на пашырэнне долі забеспячэння ўнутранага рынку краіны айчыннымі таварамі.

Асноўныя стратэгічныя задачы краіны для паспяховага развіцця: рост экспарту тавараў і паслуг, павышэнне яго эфектыўнасці, павелічэнне рэнтабельнасці экспартных паставак, выхад на станоўчае сальда знешняга гандлю і г. д. [5]

Найбольш выгадным варыянтам для эканомікі Беларусі з'яўляецца развіццё вытворчасцей на мясцовых рэсурсах.

Актуальнасць тэмы імпартазамяшчэння для Рэспублікі Беларусь выклікана неспрыяльнай тэндэнцыяй у знешнім гандлі, а менавіта наяўнасцю значнага адмоўнага сальда [1].